База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# Стратэгічная справа

**«Связистом быть — нелёгкая судьба...» — тэта радкі з песні гурта «Голубые береты». У некаторым сэнсе — гімна сувязістам Афганістана. Безумоўна, для многіх з нас воін-інтэрнацыяналіст выклікае асацыяцыі, у першую чаргу, з дэсантнікам, разведчыкам. Але не трэба забываць пра людзей, якія наладжвалі сувязь паміж камандаваннем і войскамі, што дазваляла аператыўна рэагаваць на шмат якія дзеянні з процілеглага боку.**

Слесар механазборачных работ цэха вытворчасці сельскага-спадарчых машын завода ліцця і нармаляў Уладзімір Дуброўскі нарадзіўся ў пасёлку Гаёк Чачэрскага раёна. Пасля заканчэння сярэдняй школы амаль год працаваў трактарыстам у мясцовай гаспадарцы. Потым — армія.

— Гэта зараз «косяць», а ў той час у армію не схадзі — з табой ні адна дзяўчына гуляць не пойдзе, — кажа субяседнік. — Усім пасёлкам праводзілі! Мая служба прыйшлася на 1986- 1988 годы. Дзе буду служыць — не ведаў, пакуль на асабістай справе не прачытаў «годны для службы ў краінах з гарачым кліматам». Зразумела, што не Афрыка. Хаця размеркаванне ішло па ўсіх краінах, дзе былі савецкія пасольствы. Служба праходзіла непасрэдна ў Кабуле. Горад напрыканцы вайны быў адносна спакойным, хаця дзе-нідзе перастрэльваліся.

З моманта вываду савецкіх войскаў з Афганістана прайшло ўжо 30 гадоў. Але і сёння Уладзімір Уладзіміравіч шмат чаго са сваёй службы распавесці не можа. І на тэта ёсць свае прычыны — ён быў адным з тых, хто забяспечваў сувяззю штаб 40-й арміі з Масквой, Ташкентам. Служыў ва ўрадавай сувязі.

— Ад звычайных сувязістаў мы адрозніваліся тым, што мелі іншыя станцыі і Іншыя заданы. Мы не бегалі з маленькімі радыёстанцыямі. Адна такая ў нас была з чатырох машын, — удакладняе ён. - У бойках быць не давялося. Нават калі і наладжвалі сувязь падчас непасрэдна баявых аперацый, то нашы машыны стаялі далёка ад месцаў дзеяння. Сувязь — гэта «нервы арміі». Каго «духі» забівалі ў першую чаргу? Сувязістаў і снайпераў.

— **Што вам больш за ўсё запомнілася?**

— Першае ўражанне, калі прыляцелі ў Афганістан: борт заходзіць на пасадку, я гляну ў у ілюмінатар - божа мой, адны горы, усё шэрае навокал! Жара, дарэчы, там не такая, як тут. Суха было вельмі. «Хэбэшку» памыў, і праз паўгадзіны яна сухенькая.

Уладзімір Дуброўскі пасля арміі адразу накіраваўся працаваць на завод ліцця і нармаляў. Спачатку быў трактарыстам транспартнага цэха («шчыраваў» па заводзе на Т-40), потым працаваў у службе аховы (гэты перыяд прыйшоўся, у тым ліку, і на 90-я годы - завод працаваў з перапынкамі, а сцерагчы маёмасць было неабходна). На цяперашнім месцы працуе больш дзесяці гадоў. Збірае ўсё, што збіраецца,

—бавоўна-,бульбаўборачную і іншую тэхніку.

Кажа, што ў кожнай машыны ёсць свае складанасці.

Сёння Уладзімір Дуброўскі з'яўдяецца старшынёй Завадской пярвічнай арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў. Яна налічвае больш за 40 чалавек.

— 15 лютага, як і кожны год, будзем прымаць удзел у гарадскіх мерапрыемствах, у тым ліку ва ўскладанні вянкоў і кветак да мемарыялу воінам-інтэрнацыяналістам. Абавязкова наведаем магілкі ў Гомелі («Паўночныя» у завадскім

мікрараёне), Шарсціне, Пакалюбічах, дзе пахаваны злінаўцы-афганцы. Кіраўніцтва завода разам з прафсаюзным камітэтам без праблем выдзяляюць нам аўтобус, аказваюць матэрыяльную дапамогу. Старшыня прафкама Юрый Сдкалоўскі паклапаціўся пра тое, каб у мінулым годзе мы на мора з'ездзілі падчас тура выхаднога дня. Падтрымка ёсць па ўсіх пытаннях.

**Яўген КАНАВАЛАЎ.**
Фота **аўтара**